**Валянціна Сцяпурка, настаўніца пачатковых класаў**
**Святлана Лафюк, мастак**
**ДУА «Гімназія г. Белаазёрска»**

# *Падарожжа ў горад Майстроў*

2011

*Занятк і 1*

**Майстар —** спецыяліст у якой-небудзь справе.

**Майстэрня —** памяшканне, дзе працуе майстар.

## Працоўная сям'я

У сям'і Петрыка ўсе майстры. Дзядуля працуе майстрам на трактарным заводзе. Бабуля — майстрыха на ткацкай фабрыцы. Тата майструе халадзільнікі «Атлант», а мама па-майстэрску выпякае хлеб у пякарні. Збяруцца ўвечары дома, кожны пра сваю працу расказвае. А Петрыку цікава, слухае ды задумваецца.



І надумаў хлопчык здзівіць родных, навучыцца майстраваць. Утварыў ён майстэрню ў сваім пакоі. Расклаў на пісьмовым стале зламаныя цацкі, металічны канструктар ды іншыя рэчы. Тры дні старанна стукаў, круціў, прыладжваў...

І вось на стале стаіць робат. Няхай сабе са старога канструктара, дроту, шпулек, але зроблены сваімі рукамі.

Увечары, хвалюючыся, Петрык паказаў свой выраб родным. Прыдзірліва разглядалі робата дзядуля і тата. Усміхаліся мама і бабуля.

— Майстар расце, — нарэшце ацаніў работу дзед. — Але многаму трэба яшчэ вучыцца.

— Збірайся, сынок, у падарожжа. Прыйшоў час адправіцца табе ў горад Майстроў. Пабачыш майстроў за іх справамі. Можа знойдзеш занятак сабе па сэрцу, — сказаў тата.



# Горад Майстроў



У горадзе гэтым
умельцы жывуць:
кашы́ выплятаюць,
падковы куюць.

З ліпкае гліны
лепяць збанкі́.

З нітак бялю́ткіх
ткуць ручнікі.

Хлеб выпякаюць
і ша́фы майструюць.
Без спра́вы ніколі
яны не сумуюць!




*Які майстар — такая работа.*
*Вочы страшацца, а рукі робяць*

*Заняткі 2*

## Кавальства

**Каваль** — майстар, які працуе з металам.

**Кузня** — майстэрня, дзе працуе каваль. Каб бараніцца ад пажараў ды залішняга шуму, кузню будуюць воддаль жылля людзей, на беразе ручая ці сажалкі.

## У кузні

Каб каваль мог вырабіць што-небудзь з цвёрдага кавалка жалеза, трэба яго нагрэць, ажно раскаліць. Зрабіць мяккім, паддатлівым. Для гэтага ў кутку кузні стаіць адкрытая печ — *горан*.



У кузні горача, дымна. У горане цэлы дзень гарыць агонь. І каб ён гарэў як мага мацней, падручны каваля паддзімае ў горан паветра *скураным мехам*.

Пасярэдзіне кузні стаіць тоўстая калода з жалезнай падстаўкай — *кавадла*. На кавадле каваль працуе з гарачым металам. Побач знаходзіцца карыта з вадой.

На сценах кузні паліцы. На паліцах *прыспасобы*, якія зрабіў сам майстар. Тут вялікія і малыя *малаткі, абцугі.* Для прабівання адтулін у нагрэтым метале — *прабойнікі. Зубілы*, якімі каваль сячэ метал. Для вырабу цвікоў — *цвікарні*.



Каля сцяны з акенцам стаіць спецыяльны стол — *варштат*. На варштаце прымацаваны ціскі. Побач ляжаць інструменты для заточкі і рамонту вырабаў.

*Заняткі 2*

## Як працуе каваль?

Каля горана стаіць майстар-каваль. У руках каваля доўгія абцугі. Кавалак жалеза ў горане накаліўся, ажно пабялеў. Майстар абцугамі выцягвае жалеза з горана і кладзе на кавадла. Тут у работу ўступае падручны-малатабоец.

— Бум! — што сілы б’е малатабоец па жалезу цяжкім малатком.

— Дзінь! — гэта каваль б’е меншым малатком.

— Дзінь-бум! Дзінь-бум! — ляцяць па кузні іскры.

Жалеза сплюшчваецца, пашыраецца ў бакі. Праз нейкі час жалеза зноў кідаюць у горан, разаграваюць і — на кавадла...

Вось цяпер, у поўнай меры, праяўляецца майстэрства каваля. Ён старанна б’е па жалезу то малатком, то малаточкам. Абцугамі пераварочвае яго з боку на бок. І паступова звычайны кавалак жалеза ператвараецца ў падкову, серп ці меч. Гатовы выраб каваль апускае ў карыта з вадой — загартоўвае.

Каб добраму майстру зрабіць падкову, трэба тры-чатыры разагрэвы.

### Кузня

Звон ад кузні на ўсю даль —
тут каваль гартуе сталь.
Вылятаюць з горна іскры,
мех кавальскі дыша быстра.

Ці-ку, ці-ку! Ці-ку-так! —
малаточак б’е ў такт.
Каля майстра неадлучна
завіхаецца падручны.

Дзінь-бух-ах! Дзінь-бух-ах! —
ходзіць молат у руках.
Малаточак па кавадле
звоніць дружна і заядла.

*Станіслаў Шушкевіч*



.☼ Праца ў каваля заўсёды была вельмі адказная і цяжкая. У народзе каваля паважалі, называлі чараўнікам.

Ад слова *«каваль»* утварылася многа прозвішчаў: Кавалёў, Кавалевіч, Кавальчук, Кавалеўскі, Кавалец і іншыя. Кавальскае прозвішча і ў беларускага касманаўта Уладзіміра Кавалёнка.

Пашукай на карце Беларусі назвы населеных пунктаў, якія таксама ўтварыліся ад слова *«каваль»*.

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

## Утвары новыя словы

| | | |
|---|---|---|
| *вы*каваць | *за*каваць | *да*каваць |
| ___каваў | ___каваў | ___каваў |
| ___кує | ___кує | ___кує |

## Скорагаворка

*Каваль каваў, каваў ды не дакаваў;*
*дакоўваў, дакоўваў ды перакоўваў.*

## Правер сябе

Майстар, які працуе з металам — ____________.

Печ, у якой разаграваюць метал — ______________.

Прыспасоба, якою майстар дастае гарачы метал — _____________.

Калода з жалезнай падстаўкай — ______________.

Майстэрня каваля — _____________.

Памочнік каваля, які працуе цяжкім малатком — _________________ _________________.

*Заняткі 3*

## Што кавалі кавалі?

У кожнай хаце горада Майстроў ёсць рэчы, якія выкаваў каваль.

Дзверы ў хату трымаюцца на жалезных завесах. Каб іх адчыніць, націскаем на жалезную клямку. Да дзвярэй выкаваны замок з ключамі.





Увойдзем у хату.

У кутку каля печы стаяць вілкі, чапяла і качарга. На прыпечку красуюцца патэльні, вялікія чыгуны і маленькія чыгункі. Дзверцы і юшка ў печы, таксама праца каваля.

На лаве драўлянае вядро з вадой, а на ім жалезныя абручы і ручка. На паліцы нажы і нажніцы. Усё гэта — *гаспадарчыя прылады*, патрэбныя для жыцця людзей.

Прачытай працяг верша С. Шушкевіча *«Кузня»*. Знайдзі ў ім гаспадарчыя прылады, якія выкавалі кавалі.

Паглядзі — і ўжо гатовы
коням новыя падковы.
Толькі коней прывялі —
падкавалі кавалі.

Тут завеса, тут замок,
тут акованы вазок.
Тут матыка, плуг, тапор —
навалілі поўны двор...

Вылятаюць з горна іскры,
мех кавальскі дыша быстра.
Ці-ку, ці-ку! Ці-ку-так! —
малаточак б’е ў такт.





Умелы каваль з кавалка жалеза мог зрабіць *даспехі і зброю* для воінаў.

Даспехі — гэта кальчуга, шлем і шчыт, якія засцерагалі іх у час бітвы.

Кальчуга — выплеценая з жалезных калец кашуля. Майстар выкоўваў дрот, разрубваў яго на аднолькавыя кавалкі. З драцяных кавалкаў рабіў кольцы, якія надзейна злучаў паміж сабой. Вырабляў каваль і кальчужныя шапачкі, якія надзявалі пад шлем, кальчужныя рукавіцы і нават порткі.

Зброя — гэта меч, лук або самастрэл, кап'ё, сякера ці булава.

Каваль, які каваў зброю, добра ведаў сакрэты метала. Ён рабіў зброю моцнай, трывалай. Каб у час бітвы не зазубрыўся ці не зламаўся меч, не сагнулася булава.



Кавалі кавалі і такія неабходныя ў жыцці рэчы, як іголкі, шпількі, шылы, напарсткі, гузікі, засцежкі, спражкі.



☼ Дзе кавалі бралі жалеза?

У нашай краіне ёсць назвы вёсак са словам *рудня*. Чырвоная Рудня ў Барысаўскім раёне, Старая Рудня ў Жлобінскім і Астравецкім раёнах.

Аказваецца, у гэтых мясцінах было многа балотнай ці азёрнай жалезнай *руды*. З гэтай руды ўмелі майстры выплаўляць жалеза.

Паспрабуй знайсці на карце Беларусі і іншыя вёскі са словам *рудня.*

## Скорагаворка

*Каваль каваў каня.*
*Конь каваля — капытом,*
*каваль каня — калом.*

## Прыказкі

*Каваль каня куе — і жаба нагу дае.*
*Добры каваль і жабу падкуе.*

## Загадкі з кавалёвай хаткі

Жалезны нос
у зямлю ўрос.

Рота няма,
а зубы маюцца.

Маленькі,
гарбаценькі
ўсё поле абскача.

Маленькі,
гарбаты
сцеражэ
хаты.

Два кальцы,
два канцы,
пасярэдзіне
пупок.

Па полі ходзіць
і дзіры робіць.

*(Серп, іголка, замок, нажніцы, плуг, граблі. )*

*Заняткі 4*

# Ткацтва

**Ткацтва** — гэта майстэрства выrабляць **тканіну**.
**Ткач** ***(ткачыха)*** — майстар, які на спецыяльным станку тчэ тканіну.
**Кросны** — самаробны ткацкі станок.



## Як працуе ткач?

Каб выткаць тканіну, ткач спярша рыхтуе *кросны.*

Перш-наперш навівае ў кросны доўгія ніткі — *аснову* будучай тканіны. Дзеліць ніткі асновы на дзве часткі — верхнюю і ніжнюю.

Потым ткач рыхтуе *ўток* — папярочныя ніткі. Ён навівае іх на драўляныя трубачкі — *цэўкі*. Цэўку ўстаўляе ў *чаўнок*.

Калі ўсё гатова, ткач садзіцца за кросны.

У руцэ чаўнок, з якога цягнецца нітка ўтку. Ткач папераменна націскае нагамі на *панажы*. Пры гэтым верхняя і ніжняя часткі асновы мяняюцца месцамі. Паміж імі ўтвараецца праход, у які ткач напраўляе чаўнок. Нітачку ўтку з чаўнака ён акуратненька кладзе паміж ніткамі асновы і прыціскае *бёрдам* — спецыяльным грэбнем. Ніткі асновы і ўтку пераплятаюцца, і атрымліваецца тканіна.

Рыпяць панажы, мільгае ў руках ткача чаўнок, стукае бёрда. Накручваецца на вал тканіна...

## Юная ткачыха

Сёння зранку дзед Сямён
пільны клопат мае —
зняў з гарышча кросны ён,
ля акна стаўляе.

— Кросны! Кросенцы!!
Ура! — радасна Натулі.
Дзіваў гэтулькі яна
пра красёнцы чула.

— Буду ткаць і я абрус! —
круціцца Наташа.
Усміхнуўся дзед у вус
ды дзяўчынцы кажа:

— Ты бабулі памагай,
калі ўстала рана...
На вось ніткі патрымай
і чаўнок таксама.

Аж да вечара, да зор,
было ў хаце ціха:
Малявала ўсё ўзор
юная ткачыха.

*Генадзь Пашкоў*

## Што ткалі ткачы?

Чалавеку нельга без *адзення*. Таму ткачы на кроснах ткалі тканіну для шыцця адзення. Тонкую белую — на кашулі і фартухі, грубейшую каляровую — на штаны, спадніцы.

*Ручнікі...* Гэта не проста кавалкі тканіны, якімі выціраліся. На ручніках падносілі хлеб-соль, сустракаючы гасцей. На іх ставілі маладых у час вяселля. Ручнікамі ўпрыгожвалі хату. У кожнага ткача яны свае. Белашэрыя, з папярэчнымі палоскамі, або затканыя па ўсім полі ўзорамі кветак, галубоў, пеўняў. Ткалі ткачы ручнікі, быццам песню складалі.

*Посцілкі, дываны, абрусы, сурвэткі, паясы, хаднікі...* Самыя розныя па колерах і па ўзорах. На кроснах, пад рукамі ткачоў, нібы летні луг расквітнеўся.



## Скорагаворка

*Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне.*

## Дапішы літары ў словах

| | | |
|---|---|---|
| кро . ны | тк . . іна | . . рвэткі |
| чаў . ок | . . чнікі | посці . кі |
| ц . ўка | а . русы | хад . . кі |
| . . нажы | . . ясы | . . ваны |

*Заняткі 5*

# Матэрыялы для ткацтва

## Лён, лянок, ляночак

Чаму ў горадзе Майстроў кажуць, што кашуля ды спадніца ў полі выраслі? А таму, што ў полі расце лён.

Лён, лянок, ляночак — гэта дзівосная расліна, якая апранае і корміць людзей. З ільнянога семя робяць карысны смачны алей, а з валакна прадуць ніткі. Так, тыя самыя ніткі, з якіх умелыя ткачы ткуць свае цудоўныя вырабы.



## Семя

На далонь маю малое
легла семя ільняное.
Як пясчынка ўсё адно.
Ды сапраўдны скарб яно.
Бо схавана ў ім — ці чулі?

Абрусы, чапцы, кашулі,
трапяткія фартушкі,
як вясёлкі — ручнікі.
Толькі хто б мне мог сказаць,
як жа іх адтуль дастаць?

*Кастусь Цвірка*

## Лён не расце сам па сабе.

Ранняй вясною людзі засяваюць поле ільняным семем. Усходы чысценька полюць. Лянок расце, цягнецца да сонейка і зацвітае невялікімі блакітнымі кветачкамі. Ах, якая гэта прыгажосць! Поле блакітнае як неба ці мора!

Увосень лён вырываюць, абмалочваюць і рассцілаюць на лузе, каб вымак у расе. Потым яго трэплюць і чэшуць, пакуль не атрымоўваюць мяккае валакно — *кудзелю* і далікатны *кужаль* . Вось з гэтага валакна і прадуць ніткі.

Вытканую ільняную тканіну добра вымочваюць ў вадзе. Расцілаюць на расяной траве і б’юць па ёй *пранікам* — драўляным бруском. Сушаць на сонцы.

Адзенне з ільняной тканіны моцнае, прыемнае для цела. У ім не бывае горача ўлетку. Чым больш яго мыеш, тым бялейшым яно робіцца.

## Воўна

*Шчыплюць траўку каля рэчкі*
*ў цёплых кажушках . . . .*



Раней, амаль у кожным вясковым двары, гадавалі авечак. Два разы ў год, вясной і восенню, гаспадары састрыгалі іх цёплыя кажушкі. Шэрсць альбо воўну мылі, перабіралі і сушылі. Потым часалі *ваўначоскай*. З чыстай мяккай *воўны* пралі шарсцяныя ніткі.

Ткніна з шарсцяных нітак цёплая. З яе шылі адзенне для халоднай пары года.

## Як пралі ніткі?



Калісьці прасці ўмелі ўсе жанчыны, нават дзяўчаткі, былі *папрадухамі*.

*Прасніца* — драўляная прылада для прадзення. Да верхняй часткі прасніцы папрадуха прывязвала воўну, ільняны кужаль або кудзелю ў выглядзе барады. Стаўляла прасніцу на лаву і сядала на яе ніжнюю частку. Цяпер яна брала *верацяно* — драўляную вытачаную палачку. Выцягвала з барады і прымацоўвала да верацяна тонкія валокны, і пачынала работу. Трыма пальцамі левай рукі папрадуха выцягвала валокны, а трыма пальцамі правай рукі пакручвала верацяно. Калі нітка дасягала даўжыні выцянутай рукі, навівала яе на верацяно.

Работа здаецца вельмі простай, але гэта не так. Патрэбна сапраўднае майстэрства і вопыт, каб ніточка атрымвалася тонкаю і роўнаю.

Ніткі з верацён папрадуха перамотвала ў *клубкі* або ў *маткі*, калі іх трэба было фарбаваць у які-небудзь колер. Фарбамі былі настоі кары і лісця дрэў, кветак, шалупіння цыбулі.

☼ У нас час вырошчваць лён і апрацоўваць яго дапамагаюць людзям машыны. Прадзенне нітак і ткацтва тканіны адбываецца на фабрыках, на станках-аўтаматах.

А яшчэ людзі навучыліся «прасці» ніткі не толькі з ільну і воўны, але і з газу і нафты. Тканіна з гэтых нітак вельмі моцная. Падумай, дзе яе выкарыстоўваюць?

## Скорагаворкі

*Лянок не любіць лянот, лянот не любіць лянок.*
*Цярпення няма цяпер церці церніцаю лён.*

## Загадкі з ткачовай хаткі

Круглы, малы,
а за хвост
не падымеш.

Драўляны парсючок
між ніцяных загародак бегае.

Вярчуся, кручуся,
пакуль не растаўсцею.

*(Чаўнок, верацяно, клубок.)*

## Правер сябе

Майстар, які тчэ тканіну — ________________ .

Жанчына, якая прадзе ніткі — _______________ .

Станок на якім ткалі тканіну — ________________ .

Драўляная прылада для прадзення — ______________ .

Мяккае ільняное валакно — ______________ і ________________ .

Драўляная палачка, на якую папрадуха прадзе нітку — _____________.

*Занятки 6*

## Пашыў адзення

**Кравец *(краўчыха)*** — майстар, які кроіць і шые адзенне.

**Швачка** — майстрыха, якая сшывае выкраенае.

Раней кожная жанчына абшывала сваю сям'ю. Для мужа, дзяцей і сябе шыла яна сарочкі, штаны, спадніцы, сукенкі, фартухі, хусткі. Гэта было адзенне на кожны дзень. А вось святочнае адзенне і тое, якое патрабавала вялікага майстэрства, шылі краўцы.

## Што шылі краўцы?

*Зверху гола, знізу лахмата, цяплом багата. (К . . ух.)*



*Кажух, кажушок, паўкажушак* — гэта цёплая зімовая вопратка з вырабленых авечых скур, *футра*.

Вось кажухі пашыць было пад сілу толькі краўцам — майстрам-кажушнікам. Шылі краўцы прос-ценькія кажухі на кожны дзень і святочныя, якія людзі апраналі толькі ў святы і ў госці. Святочныя кажухі аздабляліся вышыўкаю, прыгожымі гузікамі.

Яшчэ кажухі былі рознага колеру — карычневыя, чорныя, белыя і рознага крою — прамыя і прыталеныя. Майстравалі краўцы і цёплыя футравыя шапкі, рукавіцы.



*Світка* — гэта доўгая верхняя вопратка з каляровай шарсцяной тканіны для восені ці ранняй вясны. Шылі краўцы світкі, таксама, розныя па колеру і крою, на кожны дзень і на святы.




## Краўчыха

У адрынцы пад страхой,
дзе спакой і ціха,
доўга світку вераб'ю
шыла вераб'іха.

Сіняй ніткай — рукавы,
а каўнер — зялёнай.
Анідзе вакол няма
гэткага фасону.

З аксаміту паясок,
барвай вышываны.
— Во, казала, — апрану
вераб'я як пана!

На прымерку прыляцеў
верабей у сені.
Кажа: — Світка так сабе.
Толькі ж дзе кішэні?

І чырыкнуў злосна ён:
— А яшчэ майстрыха!..
Ажно стрэльнула крылом
злосна вераб'іха:

— Я за век свой не адну,
шмат пашыла світак.
На кішэні ж на твае
не хапіла нітак!

*Авяр'ян Дзеружынскі*

☼ І ў нас час ёсць майстры, якія шыюць модныя кажухі. Сучасныя людзі з задавальненнем іх носяць, бо няма цяплейшай зімовай вопраткі, чым кажух. Толькі чамусьці слова *кажух* часта замяняюць словам — *дублёнка*. Знайдзі ў тлумачальным слоўніку значэнне словы *дублены*, і ты зразумееш, чаму так адбываецца.

А вось світку поўнасцю замянілі плашч і куртка. Захавалася яна толькі ў музеях і тэатрах.

## Прыказкі

*Кожны кравец сваім кроем крое.*
*Краўца не вучы, без цябе скрое.*
*Пашануй адзенне ў хаце, а яно цябе пашануе ў людзях.*

*Заняткі 7*

## Вязанне



Людзі навучыліся не толькі шыць адзенне з тканіны, але і вывязваць яго з нітак.

**Вязанне** — гэта ўменне рабіць з ніткі петлі і злучаць іх паміж сабой, каб утварылася палатно.

## Хто займаўся вязаннем?

Калісьці вязалі ў кожным доме. Звычайна вязаннем займаліся жанчыны. Дзяўчаткі, як толькі падрасталі, таксама, вучыліся вязаць. Каб асвоіць вязанне патрэбна пільная ўвага і стаіранне. Адметна, што гэты занятак хутка прыносіць задавальненне. Бо праз некалькі дзён у **вязальшчыцы**, замест клубочка нітак, новы шалік або цёплыя шкарпэткі.

А як цікава самой прыдумаць новы ўзор!..

Калі разгадаеш загадкі Надзеі Сторажавай, то ўспомніш, чым працуе **вязальшчыца**.

### Хадулі

Гэткія ў бабулі
спрытныя хадулі —
па нітачцы ходзяць,
узоры выводзяць,
лічаць вочкі і радкі,
называюцца . . .



### Павучок



Мой жалезны павучок
слухаецца пальцаў.
Абяцае, што спляце
ён каўнерык ляльцы.
Пачне ў панядзелак
павучок-. . .

*(Шыдэлак, пруткі.)*

# Што вязалі вязальшчыцы?

З дапамогай кручка ці пруткоў нават пачынаючая вязальшчыца вывязвала такія невялікія прадметы *адзення*, як шкарпэткі, рукавічкі, пальчаткі, шапачкі, шалікі. Больш вопытнай вязальшчыцы пад сілу звязаць світар, кофту, джэмпер, сукенку і нават паліто.

Усё гэта рабілі з шарсцяных нітак аднаго або некалькіх колераў. Вязанае адзенне не толькі саграваліа ў халоднае надвор’е, але і ўпрыгожвала.



*Карункі* для ручнікоў і абрусаў. Вось іх вязальшчыцы вывязвалі кручком з тонкіх адбеленых ільняных нітак. Узоры карункаў — гэта ажурныя ромбікі, лісточкі, зорачкі. Карункі вязалі шырокія і вузкія. Шырокія прышывалі да краёў ручніка, а вузкімі маглі ўпрыгожыць ручнік па ўсёй яго даўжыні.



Карункамі ўпрыгожвалі жаночае і дзіцячае адзенне: каўнерыкі і рукавы сукенак, галаўныя ўборы, фартухі, насоўкі.





*Ажурныя сурвэткі, абрусы*. Таленавітыя вязальшчыцы стваралі такую прыгажосць, прыдумвалі свае ўласныя ўзоры вязання.





*Цацкі, цацачныя вырабы*. У вязальшчыцы заўсёды заставаліся невялічкія клубочкі нітак. З гэтых рэштак, яна вывязвала цацкі для дзяцей: ляльку-прыгажуню, хітрае мышанятка, смешнага сабачку ці коціка-гарэзу. Дзяўчаткі-вязальшчыцы таксама вязалі цацкі і ўпрыгожванні для сябе.







☼ Людзі даўно прыдумалі вязальныя машыны. Машыны вяжуць хутка, прыгожа. Вывязваюць самыя складаныя ўзоры.

Але, і дарослыя, і дзеці з задавальненнем вяжуць пруткамі і кручком. Падумай і запішы, у чым сакрэт гэтага занятку.

## Крыжаванка «Перакладчык»



*1. Носки. 2. Кружева. 3. Варежки. 4. Перчатки. 5. Шарф. 6. Пальто.*

*Заняткі 8*

# Выраб абутку

Ніхто не можа абысціся без абутку. А які абутак самы лепшы? Вядома, што скураны. Скуры жывёл спецыяльна *вырабляюць* — ачышчаюць ад тлушчу і поўсці.

**Шавец** — майстар, які шые скураны абутак.

## У майстэрні шаўца

У майстэрні шаўца пахне вырабленымі скурамі. На шырокіх паліцах скруткі скуры чорнага, жоўтага і чырвонага колераў. Тут жа клубкі *дратвы* — тоўстай прасмоленай або навошчанай ніткі для шыцця абутку.

Каля акна варштат — спецыяльны стол шаўца. На ім ляжаць інструменты: пляскаты малаток, нож і нажніцы, рашпіль, шыла, вастрагубыя абцугі, іголкі, цвікі. Каля стала, на падстаўцы, стаяць выструганыя з ліпы *капылы*. Капыл — гэта кавалак дрэва ў форме ступні, на якім майстар робіць абутак.

За сталом сядзіць шавец у скураным фартуху. Перад ім выразаныя са скуры дэталі абутку і капыл. Майстар акуратна накладвае дэталі на капыл, падганяе іх па размеру і пачынае сшываць.



## Што шылі шаўцы?

Прыгледзься, у што абуты жыхары горада Майстроў.

На нагах мужчын *чаравікі* ці *боты*, са скуры цёмнага колеру.

Чаравікі, боты і *туфлі* жанчын розных колераў, на сярэднім або нізкім *абцасе*. Абутак шнууецца скуранымі раменьчыкамі або зашпільваецца на гузікі.

У дзяцей — каляровыя *паўбоцікі* і *чаравічкі*.

На некаторым жаночым і дзіцячым абутку вышыты прыгожыя ўзоры яркімі шарсцянымі ніткамі.

Вось такі абутак на заказ шылі шаўцы. Каштаваў ён дорага, але быў добра падагнаны на нагу, доўга насіўся. Канешне, абутак берaглі, насілі вельмі акуратна.

Займаліся шаўцы і рамонтам абутку.



## Самы старажытны абутак

Самым старажытным скураным абуткам з’яўляліся *поршні* ці *пасталы*.

Поршні не шылі, а згіналі з аднаго кавалка мяккай скуры. Краі скуры на наску і пятцы злучаліся вузкімі раменьчыкамі.

Па краях борцікаў былі проразі, у якія працягваліся шырэйшыя раменьчыкі. Імі поршні сцягваліся і мацаваліся да нагі.

Каб надзець поршні, нагу абгортвалі мяккай тканінай — *анучамі*.



☼ Цяпер абутак, у асноўным, шыюць на вялікіх абутковых фабрыках. Там спецыяльныя машыны, станкі-аўтаматы значна спрашчаюць працу шаўца.

Падумай, якія новыя віды абутку з'явіліся ў нас час. Запішы іх назвы.



____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

Пацікаўся ў абутковым магазіне, з якіх фабрык яны завозяць абутак.

## Хто што зрабіў?

булава джэмпер хаднікі

**Кравец —**

абрус шалік качарга

**Каваль —** шкарпэткі ручнік пояс

завесы карункі кажух

**Шавец —**

боцікі плуг сурвэтка

**Ткач —** посцілка замок туфлі

**Вязальшчыца** — чаравікі світка чапяла

*Заняткі 9*

# Пляценне

**Пляценне** — гэта ўменне пераплятаць гнуткія дубцы, каб атрымаўся выраб. Гэта адно з самых першых майстэрстваў, якому навучыліся людзі.

**Пляцельшчык** — майстар, які выплятае самыя розныя рэчы.

## Матэрыялы і інструменты для пляцення

Кажуць, што матэрыялы для пляцення проста «пад рукой» растуць. У полі — залатая саломка жыта і пшаніцы. Каля рэчкі, возера ці сажалкі — лаза. У лесе — дубцы арэшніку і ядлоўцу, тонкія карані хвойных дрэў, кара бярозы і ліпы. Іх трэба толькі правільна нарыхтаваць.

Інструменты ў майстэрні пляцельшчыка простыя: кусачкі, круглагубыя абцугі, нажы і нажніцы, шыла. Яны не займаюць многа месца.

Пляценнем могуць займацца і людзі са слабым зрокам, нават сляпыя. Не патрэбна і вялікай сілы ў руках, а толькі веданне прыёмаў пляцення.









## Што плялі пляцельшчыкі?

У Беларусі расце 20 відаў лазы. Гнуткімі лазовымі дубцамі людзі карысталіся даўно. З тоўстых дубцоў выпляталі сцены пабудоў, пляцень вакол сядзібы.

З тонкіх дубчыкаў плятуць лазовыя кошыкі. У іх збіраюць садавіну і агародніну, ягады і грыбы.

У многіх дамах можна ўбачыць прыгожыя плеценыя хлебніцы і падносы.

А які дзівосны цуд выплеценая з лазы мэбля! Сталы і крэслы нагадваюць адмысловыя карункі. .

*Лозапляценне* — самы старажытны від пляцення.

*Саломапляценне* таксама вядома з даўніх часоў.

З саломы майстры выплятаалі *посуд*.



Саламяныя жгуты пераплятаалі лазовымі дубцамі і атрымлівалі вялікія, у рост чалавека, *кублы*. Кубел зачыняўся вечкам, каб лепш захоўвалася зерне ці мука. Цяпер кублы можна ўбачыць толькі ў музеях.

У наш час з саломы выплятаюць вазы, хлебніцы, цукерачніцы.



Прыемна атрымаць ў падарунак такую прыгажосць, як саламяны *куфэрак* ці *шкатулку*. У іх можна захоўваць ніткі і іголкі, заколкі, пацеркі, бранзалеты і іншыя ўпрыгожванні.





*Саламяныя цацкі* — гэта фігуркі, зробленыя з распараных жытніх саломінак.

Саломка складвалася ў пучкі і туга перавязвалася. Яшчэ крыху фантазіі, майстэрства, і дзеці цешыліся лялькай, конікам, паўлінам, пеўнікам...



*Лыка* — палоскі кары маладой ліпы.

З лыка плялі *лапці* — лёгкі абутак. На баках лапцяў рабілі петлі-вушкі. Праз вушкі працягвалі *абору* — ільняны шнурок. Надзявалі лапці на анучы і прымацоўвалі да нагі аборай.

Лапці былі не вельмі моцным абуткам. Іх хапала на 7-10 км дарогі. А добры танцор мог «станцаваць» лапці за вечар.

☼ *Брыль* — так раней называлі лёгкі саламяны капялюш. Насілі брыль толькі мужчыны.

Цяпер саламяныя капялюшыкі, з рознымі па шырыні палямі, надзяваюць і дзеці, і жанчыны. Яны заўсёды ў модзе і ўсім да твару.



А ад чаго засцерагае галаву чалавека саламяны капялюш ?

__________________________________________________________

__________________________________________________________

## Скорагаворка

*Лазар з лазы пляце вазы, а Сымон з саломы пляце вазы.*

## Дапішы словы

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| пляце | куе | тчэ | шые | |
| *пляцельшчык* | __________ | ________ | __________ *і* | __________ |
| *кашы* | __________ | ________ | __________ | __________ |

## Збяры прыказкі

| | |
|---|---|
| Як не старайся, | покуль новага не пашыў. |
| Сем разоў адмер, | а чалавек адзенне. |
| Той не памыляецца, | а ў кашы кашы не зварыш. |
| Не адзенне красіць чалавека, | адзін раз адрэж. |
| Не ганьбуй старым ботам, | хто нічога не робіць. |

*Занятки 10*

# Сталярства

Наша краіна багата лясамі. Здаўна людзі жывуць ў драўляных дамах і карыстаюцца вырабамі з дрэва.

Спачатку дрэвы ў лесе пілуюць, ссякаюць з іх галіны і кару, два-тры месяцы сушаць. Так атрымліваецца *драўніна*, з якой вырабляюць розныя сталярныя вырабы.

**Сталярства** — майстэрства апрацоўкі драўніны і вырабаў з яе.

**Сталяр** — майстар, які працуе з драўнінай.



## У майстэрні сталяра

У **сталярні**, майстэрні сталяра, светла, прыемна пахне дрэвам, смалою.

На сценах размешчаны сякеры і пілы, гэблікі і фуганкі. На шырокіх паліцах ляжаць вялікія і малыя малаткі, долаты і стамескі, свердзелы і свярдзёлкі, разцы і скоблі. Стаяць скрыначкі з цвікамі.

Каля вялікага акна варштат — спецыяльны сталярны станок. Тут завіхаецца сталяр.

Майстар складным метрам размерыў драўляны брусок. Разрэзаў яго невялікай ручной пілой — нажоўкай. Патрэбную загатоўку прымацаваў на варштаце і габлюе яе гэблікам.

Пахучыя жоўтыя стружкі выкручваюцца з гэбліка, падаюць на варштат і падлогу, шамацяць пад нагамі сталяра...

## Што выраблялі сталяры?

Сталяры знալі сакрэты кожнага дрэва. Драўніна ясеня і дуба трывалая, не баіцца дажджу і ветру. З яе рабілі аконныя *рамы* і *дзверы*.

З бярозы і алешыны выраблялі майстары прыгожую драўляную *мэблю*. Шафы і паліцы, сталы і камоды, ложкі і дзіцячыя ложкі — калыскі.

Драўляны *посуд*: лыжкі, талеркі, хлебніцы, сальніцы, падстаўкі. Іх рабілі з драўніны ліпы і бярозы.

Многія *гаспадарчыя прылады* выраблены сталярамі: граблі, вілы, бораны, дэталі кроснаў, вуллі, лодкі.

## Куфар



Раней у кожным доме быў *куфар*. У куфры гаспадары захоўвалі святочнае аддзенне, тканіну, каштоўныя рэчы.

Рабілі майстры куфры з дошак асіны. Былі ў куфраў кароценькія ножкі-падстаўкі. З бакоў — металічныя ручкі, каб яго пераносіць. Вечка і бакі акоўвалі металічнымі палоскамі для трываласці.

А як прыгожа размалёўвалі куфры! Яркімі колерамі, адмысловымі ўзорамі. Тут букеты і вянкі кветак, дзівосныя птушкі

Самаробныя драўляныя *цацкі.*

Іх вельмі любілі дзеці, бо яны перадавалі рух ці дзеянне. Унутры такіх «жывых» цацак майстары змяшчалі хітрыя механізмы. Мядзведзі-пільшчыкі пілавалі дрэва. Фігуркі двух кавалёў па чарзе білі па «кавадле». Былі яшчэ і зайцы-музыкі з барабанам, і мядзведзі на веласіпедах, і матылькі, што махалі крыльцамі.



## Скорагаворка

*Сталяр стругаў, стругаў, не дастругаў,*
*стаў дастругваць — перастругаў.*

## Дапішы літары ў словах

| | | |
|---|---|---|
| гэ_ лік | дра_ ніна | _ афа |
| фуг_ нак | _ уфар | па_ _ца |
| нажо_ка | ка_ _ска | гра_лі |
| стаме_ ка | _ _ веры | _ _ мода |

## Загадкі са сталяровай хаткі

І са звонам, і са спевам
угрызаецца ў дрэва,
раз — наперад, раз — назад,
зубы ззяюць, апілкі ляцяць.

Цэлы дзень кланяецца
прыйдзе дамоў —
расцянецца.

Жук сталёвы
навылёт,
зверху ўніз,
дуб прагрыз.

Як вазьму цябе ў руку,
трапна б’еш ты па цвіку.

*(Малаток, свярдзёлак, піла, сякера.)*

*Заняткі 11*

## Ганчарства



З даўніх часоў людзі карысталіся посудам з гліны. Рабілі гліняны посуд сапраўдныя майстры-умельцы.

**Ганчарства** — уменне вырабляць з гліны гаспадарчы посуд і іншыя рэчы.

**Ганчар** — майстар, які працуе з глінай.

## Як нараджаецца посуд?

Спачатку ганчар капае гліну на *гліні́шчы*. Нарыхтаваную гліну замочвае вадой, старанна вымешвае, дабаўляючы пясок.



Далей майстар садзіцца за *ганчарны круг* — спецыяльны станок. Бярэ камяк вымешанай гліны, прымацоўвае яго на верхнім дыску ганчарнага круга. Нагою моцна раскручвае невялікі ніжні дыск.

І вось тут адбываецца цуд. Пад умелымі пальцамі майстра вырастае гаршчок ці збанок.

Пры жаданні ганчар аздабляе яго прамымі і хвалістымі палоскамі, кружочкамі і кропкамі, узорамі кветак і лісцікаў.

Гатовы выраб майстар акуратна зразае з круга тонкім дроцікам. Ставіць яго прасохнуць спачатку ў вільготным месцы, а потым у хаце. «Свежы» посуд баіцца скразнякоў і прамых сонечных промняў.

## Ганчар

Ганчар — сапраўдны чараўнік.
Ён гліны ўзяў камяк,
і вось збанок на крузе ўзнік,
а потым круглы гляк.

*Артур Вольскі.*

## Як посуд робіцца моцным?

Шмат посуду зрабіў ганчар. Высушыў яго. А карыстацца ім нельга. Калі ў такую пасудзіну наліць гарачае вады, то яна адразу разваліцца. Такія вырабы нікому не патрэбны.

Каб зрабіць посуд моцным, трэба яго *абпаліць* у *ганчарным горане* — спецыяльнай печы. Закладвае ганчар свае вырабы ў горан, разводзіць моцны агонь і напальвае іх дабяла.

Цяпер наступае час *гартавання*. Вымае майстар напаленыя вырабы з горана і апускае іх у карыта з кіслым растворам жытняй мукі. Посуд становіцца моцным. Ён не размокне нават ад кіпеню.

☼ Глініца, Глінка, Гліняная, Глінянка — вось некаторыя вёскі, назвы якіх утварыліся ад слова *«гліна»*. Падумай, якія назвы вёсак і прозвішчы людзей маглі утварыцца ад слова *«ганчар»*.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

## Скорагаворка

*Ганчар на глінішчы ў гліне гразне,*
*гразне ў гліне ганчар на глінішчы.*

*Заняткі 12*

# Што выраблялі ганчары?

## Ганчары



Мы былі на глінішчы,
брали гліну ў прыгаршчы.

Шмат на ганак нанасілі,
там мяшалі і мясілі.

Наляпілі *гладышоў*,
*місак, сподкаў, спарышоў.*

Хіба ж мы не ганчары
ды не працавітыя?

Усе ж лаўкі на двары
посудам укрытыя.

*Станіслаў Шушкевіч.*

## Посуд



Для гатавання ежы: *гаршкі* і патэльні. Гаршкі былі ў кожнай хаце: белыя, шэрыя, чырванавата-карычневыя. Амаль круглай формы, з адной ці з дзвюма ручкамі. Іншы раз з накрыўкаю. Вельмі смачная ежа ў гаршках атрымлівалася.

*Збанкі* і *гладышы* для малака і смятаны. Збанок даволі высокая пасудзіна з ручкай і носікам. Гладыш — збанок без ручкі і носіка, з верхам шырэйшым за дно.

*Гляк* —пасудзіна, падобная на шар. З вузенькім горлам, шырокім плоскім дном, з адной ці дзвюма ручкамі. У гляку добра захоўваўся алей, бярозавы сок, сцюдзёная вада.



*Спарыш (двайнік, парнік)* — два невялікія гаршочкі, злепленыя разам, і з агульнай ручкаю. У іх насілі абед касцам ці жнеям. У адным гаршочку — суп, у другім — каша.



*Міскі, паўміскі, сподкі, кубкі*. Вялікія і малыя, простыя ці з малюнкамі і ўзорамі. Імі карысталіся кожны дзень.

*Дэкаратыўны посуд*: букетнікі, вазы, розныя сасуды ў выглядзе бараноў, мядзведзяў, ільвоў.



## Цацкі



Дзеці вельмі любілі рознакаляровыя гліняныя *свістулькі.* Былі яны ў выглядзе конікаў, пеўнікаў, баранчыкаў, лялек. Дуеш у такую свістульку, і залівісты свіст чуваць ажно пакуль хапае дыхання.



Над калыскамі немаўлят вешалі на шнурочку гліняныя шарыкі з каменьчыкамі ўнутры. Дакранецца дзіця рукою да цацкі, а яна круціцца. Каменьчык унутры бразгоча — дзіця цешыцца.

Калі разгадаеш крыжаванку **«Посуд»**, то даведаешся, як называліся такія цацкі.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | з | | а | | о | к | |
| | | | п | | р | ы | ш | | | |
| | | | | л | | д | ы | ш | | |
| | | | в | а | | а | | | | |
| | | | | | г | | | к | | |
| г | а | | ш | ч | | к | | | | |
| | | | п | а | | | | ь | н | я |
| | | | | | | у | б | | к | |
| | | | | | | с | к | а | | |

*Заняткі 13*

# Хлеб

## Галоўная ежа

Здаўна хлеб быў галоўнай ежай людзей. Нездарма казалі: *«Без хлеба няма абеда», «Без хлеба яда — да парога хада».*

Хлеба не заўсёды хапала да новага ўраджаю, таму яго вельмі шанавалі. У кавалачка хлеба, які выпадкова падаў з рук ці са стала, прасілі прабачэння.

На кожны дзень пяклі чорны хлеб з жытняе мукі. На вялікія святы — белы хлеб з пшанічнае.

## Як выпякалі хлеб?



У вёсцы кожная гаспадыня сама выпякала хлеб для сваёй сям'і.

Раз у тыдзень учыняла ў *дзяжы* цеста. Яно расло, пыхкала. З гатовага цеста гаспадыня фармавала круглыя боханы. На драўлянай лапаце саджала іх у напаленую печ на кляновае, дубовае ці капуснае лісце, каб скарынка не падгарала...

Гарачы духмяны хлеб гаспадня даставала з печы, клала на ільняны ручнік і ручніком накрывала. Калі боханы астывалі, выносіла іх у *камору*. Гэтым хлебам сям'я кармілася цэлы тыдзень.

У горадзе хлеб выпякалі пекарыхлебапёкі.

**Пекар** — майстар, які выпякае хлеб і хлебабулачныя вырабы.

**Пякарня** — майстэрня, дзе выпякаюць хлеб.

# Хлебапрадукты

Усё, што выпякаюць з мукі — гэта *хлебапрадукты*.

На кожны дзень людзі купляюць боханы чорнага хлеба, белыя батоны ці булачкі. Часта на сняданак мама пячэ блінцы, аладкі. Прыемна піць чай з хрусткімі хлябцамі, абаранкамі і бублікамі, сушкамі і сухарыкамі. Добра іншы раз паласавацца свежымі рагалікамі, кексамі, піражнымі ці тортам. А хто не любіць пернікі, вафлі, каўрыжку?..



На вяселле пякуць спецыяльны пірог — каравай. Караваем сустракаюць дарагіх гасцей.

# Хлебныя словы

Адценне слоў — не глупства,
ты ім не пагарджай.
*Скарынка. Скіба. Луста.*
*Акраец. Каравай.*

*Акраец* — шлях, дарога
і зайцаў хлеб лясны.
*Скарынка* — сум, трывога
і боль былой вайны.

А *скіба* — дзень вясновы.
Ралля. Плугі. Сяўба.
Наш хлеб — жыцця аснова,
працяг і барацьба.

А *луста* — слова сытнае,
духмянае і шчодрае,
яно ад маці — сітнае
ці наздравата-чорнае.

А *каравай* — вясельнае,
святочнае яно.
На ручніку нясе яно
і радасць і пітво.

І справа тут не ў ежы,
а ў смачным змесце слоў,
і ў жытнім ветры свежым,
і ў звоне каласоў...

*Пімен Панчанка.*

Дапоўні сказ *«хлебным»*словам з верша.

Цвёрды знешні слой хлеба — _______________.

Кавалак хлеба, адрэзаны ад непачатага бохана хлеб — _______________.

Вясельны абрадавы пірог — ___________________.

Адрэзаны нажом плоскі кавалак хлеба — ________________.

# Утвары роднасныя словы

<u>хлеб</u>

| | | | |
|---|---|---|---|
| *<u>хляб</u>ок* | ____*ны* | *<u>хлеба</u>пёк* | ______*завод* |
| ____*ец* | ____*ніца* | _____*роб* | ______*булачны* |

# Зайцаў хлеб

Дзед у лес хадзіў. І з хлебам
дома разгарнуў пакунак:
— З’есці, Мішка, яго трэба —
гэта ж зайцаў пачастунак.

Хлеб застаўся ад абеду.
Але, з’еўшы паўакрайца,
Мішка кажа: — Хлеба, дзеду,
папрасі і заўтра ў зайца.

*Віктар Гардзей.*



# Знайдзі тлумачэнне ўстойлівых выразаў

| | |
|---|---|
| *Зайцаў хлеб* | — хлеб, што патрэбен для жыцця. |
| *Лёгкі хлеб* → | — праца, якая патрабуе вялікіх намаганняў. |
| *Хлеб ды соль* | — пакараць |
| *Цяжкі хлеб* | → — праца лёгкая, бестурботная |
| *Пасадзіць на хлеб і ваду* | — пажаданне ў час ежы. |
| *Надзёнאы хлеб* | — астаткі хлеба, прынесеныя дзецям з лесу, з поля. |

*Заняткі 14*

## Казкі горада Майстроў

Доўга падарожнічаў Петрык у горадзе Майстроў. Заходзіў у майстэрні, назіраў, распытваў і нават дапамагаў. Усё хлопчыка цікавіла.

А яшчэ Петрык убачыў, што ў горадзе Майстроў жывуць добрыя, вясёлыя людзі. Яны не толькі старанна працуюць, але і жартаваць любяць. Наслухаўся хлопчык павучальных і смешных гісторый, казак...

*Добрая слава даражэй за багацце.*
*Паважай іншых — будуць і цябе паважаць.*

## Гліняная казка

Жыла на свеце цвёрдая Гліна. Нікому ад яе не было радасці. Хутчэй трэсне, чым зробіць каму-небудзь дабро.



Прыйшла аднойчы да яе Вада.

— Трэба, — кажа, — табе быць мягчэйшай. Толькі тады ты зможаш рабіць дабро.

Дакранулася да Гліны Вада — і тая адразу стала такой мяккай, што з яе кубак вылепілі.

— Будзем цяпер з табой разам людзей паіць, — сказала Вада.

— І дабро рабіць, — радасна дадала мяккая Гліна.

*Па Ф. Крывіну.*

## Чароўныя дудачкі

Жыў на свеце вясёлы ганчар. Ён рабіў гладышы і міскі.



Шмат посуду зрабіў майстар за сваё жыццё, шмат склаў вясёлых песень. Але прыйшоў час, і рукі страцілі спрыт, аслабла памяць — састарэў ганчар. Надумаў ён зра-біць гліняныя дудачкі. Дудачак выйшла сем. Ганчар даў ім назвы: До, Рэ, Мі, Фа, Соль, Ля, Сі.

Раптам асвяцілася яго бедная хаціна. Майстар убачыў перад сабой дзяўчыну з залатымі валасамі. Гэта была Песня. Яна сказала, што можа зрабіць гліняныя дудачкі чароўнымі. І будуць прыносіць яны людзям радасць.



Ганчар аддаў дудачкі Песні. І заспявалі дудачкі звонкімі галасамі. Пачуў стары майстар у іх спеве звонкі голас жаваранка над полем. Ціхі шэпт лесу, пяшчотны звон лясной ручаінкі. Слёзы радасці заблішчалі на вачах майстра...

*Паводле К. Каліны.*

*Добры каваль па пальцу не стукне,*
*умелая швачка ніткі не заблытае.*



## Доўгая нітка — лянівая швачка

Адна маладая швачка была дужа лянівая. А шыцця было шмат і нітку ў іголку прыходзілася часта ўсунаць. А швачка цярпець гэтага не магла. У акенца шыці сядзе і нітку ў іголку ўсуне не проста доўгую, а даўжэную. Шые — рукою ў акно махае.

Міма ішоў майстар-каваль, па сваіх справах спяшаўся. Раптам бачыць, нехта яму з акна рукою махае. Майстар у хату забег:

— Гаспадынька, ты навошта мяне клікала, рукою ў акно махала?

А швачка кажа:

— Ты што, з глузду з’ехаў. Я шыю, нітка доўгая, рука далёка махае.

Каваль як закрычыць злосна:

— Ты, швачка, нітку ўкарочвай і майстра з дарогі не зварочвай!

*Па Б. Шаргіну.*

# Залаты куфэрак



Далёка ці блізка, даўно ці нядаўна, жыла ў адной мясцовасці дзяўчына Прыгажуня. А ўжо якая майстрыха: і прасці, і ткаць, і шыць — усё ўмее!

Закахаліся ў Прыгажуню багаты Пан ды працавіты Каваль. Пан дзяўчыне спакою не дае. Падарункамі засыпае, засылае сватоў. А сарамлівы Каваль маўчыць пра сваё каханне, толькі цяжка ўздыхае.

Прыгажуня падарункі ды сватоў Пана назад адсылае, згоды замуж выйсці не дае. А каб Пан адчапіўся, прыдумала яму заданне. Знайсці і прынесці ёй куфэрак залаты, што як жар гарыць. А як адчыніш — гучыць дзівосная музыка.

Ніхто такога куфэрка на свае вочы не бачыў. Толькі адзін старэнькі дзядок прыпомніў, што ў далёкай краіне, за марамі, за гарамі, у самога цара, некалі быў такі куфэрак.

Пачаў Пан у далёкую дарогу збірацца ды выпадкова сустрэў Каваля. Слова за слова, а Каваль і кажа, што можа зрабіць куфэрак не горшы, чым заморскі. Пан, канешне, не паверыў, але вырашыў паспытаць майстэрства Каваля. Бо не надта ж хацелася яму ў незнаёмы свет ехаць.

Дзень і ноч працаваў у кузні Каваль, а Пан побач круціўся. Усё майстра падганяў, а больш замінаў.

Выкаваў такі Каваль залаты куфэрак. А як упрыгожыў яго адмысловымі ўзорамі, — вачэй не адарваць, што жар палае. А замок з сакрэтам уставіў — дзівосная музыка музыка зайграла. Тут Пан куфэрак ухапіў і хутчэй да Прыгажуні. Не пачуў нават, як Каваль удагонку крычаў, што ключык да замка не гатовы. Дакаваў Каваль ключык ды ўздагон за Панам кінуўся.

Тым часам, паставіў Пан куфэрак перад Прыгажуняй ды згоду выйсці за яго замуж патрабуе. А тут якраз Каваль з’явіўся, ключ да куфэрка прынёс. Як даведалася Прыгажуня, хто куфэрак зрабіў, дык адмовіла Пану. І дала згоду за Каваля замуж выйсці.

*Работа і корміць і поіць.*
*Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы*

## Лёгкі хлеб



Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці.

Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць — касец нешта есць. Падышоў да яго воўк:

— Што ты ясі, чалавеча?

— Хлеб.

— А смачны ён?

— Дзіва што смачны!

— Дай мне пакаштаваць.



Адламаў касец кавалак хлеба і даў ваўку.Спадабаўся ваўку хлеб:

— Хацеў бы я кожны дзень хлеб есці. Дзе мне яго дастаць?

— Добра, навучу цябе, дзе і як хлеб даставаць.



І пачаў ён вучыць ваўка:

— Перш-наперш трэба зямлю ўзараць, забаранаваць, жыта пасеяць. Жыта ўзыдзе, зіму перазімуе, вясной вырасце, улетку зярняты нальюцца, паспеюць.

— Ох. Вельмі ж доўга чакаць. Але цяпер я наемся хлеба ўволю!



— Рана яшчэ! Спелае жыта трэба зжаць, у снапы звязаць. Іх на сонцы прасушыць, абмала-ціць. Зярняты ў мяшкі сабраць.

— І есці хлеб буду?

— Які нецярплівы! Мяшкі на млын завезці ды мукі намалоць. З мукі цеста замясіць. А як падыдзе, у гарачую печ садзіць

— І спячэцца хлеб?

— Так, спячэцца хлеб. Вось тады і наясіся яго.

Задумаўся воўк, пачухаў лапай патыліцу і кажа:
— Не! Гэта работа занадта марудная і цяжкая. Лепш парай мне, чалавеча, як лягчэй ежу здабываць.
— Ну што ж, калі не хочаш цяжкі хлеб есці, параю табе лёгкі. Ідзі на выган, там конь пасецца.



Пайшоў воўк на выган. Убачыў каня:
— Конь, конь! Я цябе з’ем.
— Што ж, еш. Толькі спачатку здымі з маіх ног падковы, каб не ламаць табе зубы аб іх.
— І то праўда.

Нагнуўся падковы здымаць, а конь як стукне яму капытом у зубы. Перакуліўся воўк ды ходу.



Прыбег да рэчкі, Бачыць на беразе гусі пасуцца:
— Гусі, гусі! Я вас з’ем.
— Што ж, еш. Але спачатку. паспявай нам, а мы паслухаем.
— Гэта можна. Спяваць я мастак.

Сеў воўк на купіну, задраў галаву і давай выць. А гусі крыламі — мах, мах! Узняліся і паляцелі.

Злез воўк з купіны, правёў гусей вачамі. Ідзе ды лае сябе апошнімі словамі. Раптам бачыць на полі чарада авечак пасецца, а пастух спіць. Нагледзеў самага вялікага барана, схапіў яго і кажа:
— Баран, баран, я цябе з’ем.
— Што ж, такая мая доля. Але каб не мучыцца мне доўга ды і табе не ламаць зубы аб мае старыя косці, стань лепш вунь у той лагчынцы і разяў рот, а я ўзбягу на ўзгорачак, разганюся і сам ускочу табе ў рот.
— Дзякуй за параду. Так і зробім



Стаў ён у лагчынцы, разявіў рот і чакае. А баран узбег на горку, разагнаўся ды — бам! — рагамі ваўка ў галаву. Ажно іскры пасыпаліся з вачэй у ваўка, свету ён не ўбачыў.
Ачухаўся воўк, пакруціў галавою і разважае:
— Цікава: з’еў я яго ці не?
А тым часам касец скончыў работу і ідзе дахаты. Пачуў ён ваўковы словы і кажа:
— З’есці не з’еў, але паспытаў лёгкага хлеба.

*Беларуская народная казка*

*Заняткі 15*

## Кірмаш у горадзе Майстроў

Кожную нядзелю ў горадзе Майстроў адбываецца кірмаш.

Раненька, як толькі ўзыдзе сонца, на галоўную плошчу майстры вывозяць свае вырабы. Расстаўляюць, раскладваюць, развешваюць іх.

Праз нейкі час з'яўляюцца першыя пакупнікі. Нехта прыйшоў новы гаршчок купіць, некаму серп спатрэбіўся, а хтосьці надумаў лазовы кошык набыць. Падыходзяць да кожнага прылаўка, разглядаюць, прыцэньваюцца. А майстры знай свой тавар нахвальваюць:

— Купляйце боты ручной работы!
Ёсць розныя боты — на святы і да работы!
*( . . . . . )*

— Глянь, якая світка — чырвоная нітка
і чорная нітка! Хараство, а не світка!
*( . . . . . . )*

— Не праходзь міма, гаспадынька!
Куфар купляй, дачцэ пасаг складай!
*( . . . . . . )*

— Як звон збанкі, гладышы! Зроблены ад душы!
З накрыўкай гладышка — не залезе й мышка!
*( . . . . . . )*

— Купляйце паясы, з кутасамі для красы!
*( . . . . )*

— Глянь, які кошык у мяне! Сам па лесе гуляе.
Сам ягады бярэ, сам грыбы збірае!
*( . . . . . . . . . . . )*

— Шапачкі, шкарпэткі, шалікі, сурвэткі!
За пагляд грошай не бяру.
Добраму чалавеку амаль дарам аддаю!
*( . . . . . . . . . . . )*

Пакупнікі пасмейваюцца ды таксама прыгаворваюць:

— Добры тавар сам сябе хваліць.

— Куплю не куплю, а прыцаніцца магу.

— Ката ў мяшку не купляюць.

— Якія грошы, такі і тавар.

— Дарагое паносіцца ўдвое.

— Вока бачыць, а зуб няйме.

Зрабіўшы асноўныя пакупкі, людзі ўспамінаюць, што з кірмаша без прысмакаў не вяртаюцца. Тут самы час наведаць пекара. Выпіць гарачае гарбаты з пернікамі ды абаранкамі.

А яшчэ не бывае кірмаша без танцаў ды вясёлых песень. І людзі спяшаюцца туды, дзе гучыць музыка. Тут, канешне, весяліцца моладзь. Але і сталыя людзі з ахвотаю танцуюць і пяюць.

## Прыпеўкі

Я па садзіку хадзіла,
пакалола ножкі.
Купі татка чаравічкі,
а мамка — панчошкі

Чаравічкі тупу, тупу.
Бацька кажа: «Куплю, куплю!»
Маці кажа: «Не купляй,
дачцэ волі не давай!»

А я дзевачка маленька,
ў мяне плацейка рабенька.
Чаравічкі новыя,
будзьце ўсе здаровыя!

Ой, купіў сабе штаны,
не дам ніяк рады:
я зашыю спераду,
яны рвуцца ззаду

Ой, пінжак, мой пінжак,
парваныя плечы.
чым такая вечарынка,
лепей спаць на печы!

Пяяў бы я песні
ды не знаю ноты.
Абарваны кажушок,
дзіравыя боты.


С Л Р
К Ф
Л Ў
Р А
ПЛ
Ш
К БЛ
БР Ь
КУФ К
КР Л
К Ь
С П
С РА
П У
ЗА СЫ
КЛ КА
К Ц
К Х
С Т А
П
Р Ц
Ш В Ц
Т
ЧА І
Ф
Т Ч
Р Ч КІ
ХІ Д К
П
П СЦІЛ


ШЧЫК
П Р
А і
С
Б Х Ы
К
Г Ч Р
Г Ш
ЗБ
Г Ш
СП Щ
М А
СВ ЛЬ
В З ЛЬ
КІРМАШ
СВ Р
Ш ІК
ШК Р Т І
К РУН
Б С
С Р Т А

# Слоўнік

**Абрус** — скатерть.

**Абцас** — каблук.

**Абцугі** — клещи.

**Адрына** — сеновал.

**Акраец** — горбушка, краюха.

**Аксаміт** — бархат.

**Бранзалет** — браслет

**Варштат** — верстак.

**Габляваць** — строгать.

**Гарбата** — чай.

**Гэблік** — рубанок.

**Дрот** — проволока.

**Дубец** — прут.

**Дыван** — ковёр.

**Загартоўваць** —закалять

**Замінаць** — мешать.

**Кавалак** — кусок.

**Камора** — кладовка.

**Камяк** — ком.

**Карункі** — кружева.

**Каўнер** — воротник.

**Кішэня** — карман.

**Клямка** — щеколда.

**Кутасы** — кисти.

**Куфар** — сундук.

**Лагчына** — ложбина.

**Луста** — ломоть.

**Насоўка** — носовой платок.

**Падарожжа** — путешествие.

**Паддзімаць** — поддувать.

**Панчохі** — чулки.

**Пацеркі** — бусы.

**Патэльня** — сковорода.

**Посцілка** — покрывало.

**Прыгажуня** — красавица.

**Пляцень** — забор.

**Скарынка** — корка.

**Скіба** — ломоть.

**Скура** — кожа.

**Спадніца** — юбка.

**Сподак** — блюдце.

**Сукенка** — платье.

**Сурвэтка** — салфетка.

**Сядзіба** — усадьба.

**Фасон** — покрой.

**Хараство** — красота

**Цвік** — гвоздь.

**Чапяла** — сковородник.

**Чараўнік** — волшебник.

**Шамацець** — шелестеть

**Хаднік** —половик.

**Юшка** — вьюшка.

# Змест

*Занятк 1.* Уводзіны. Працоўная сям’я. Горад Майстроў 1

*Заняткі 2.* Кавальства. У кузні. Як працуе каваль? 4

*Заняткі 3.* Кавальства. Што кавалі кавалі? 7

*Заняткі 4.* Ткацтва. Як працуе ткач? Што ткалі ткачы? 10

*Заняткі 5.* Матэрыялы для ткацтва. Лён, лянок, ляночак. Воўна. Як пралі ніткі? 13

*Заняткі 6.* Пашыў адзення.Што шылі краўцы? 16

*Заняткі 7.* Вязанне. Што вязалі вязальшчыцы? 18

*Заняткі 8.* Выраб абутку. У майстэрні шаўца. Што шылі шаўцы? 21

*Заняткі 9.* Пляценне. Матэрыялы і інструменты для пляцення. Што плялі пляцельшчыкі? 24

*Заняткі 10.* Сталярства. У майстэрні сталяра. Што выраблялі сталяры? 27

*Заняткі 11.* Ганчарства. Як нараджаецца посуд? Як посуд робіцца моцным? 30

*Заняткі 12.* Ганчарства. Што выраблялі ганчары? 32

*Заняткі 13.* Хлеб. Як выпякалі хлеб? Хлебапрадукты. Хлебныя словы. 34

*Заняткі 14.* Казкі горада Майстроў. 37

*Заняткі 15.* Кірмаш у горадзе Майстроў. 42

Слоўнік *(беларуска-рускі)* 46